*Л.Ю. КАЗАКОЎ*

# СТАН ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў ШЛЯХЕЦКІХ ФАЛЬВАРКАХ У БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI – пачатку XVII ст.

Посвящена состоянию животноводства в шляхетских фольварках на Беларуси второй половины XVI – начала XVII в. На основании архивных документов, а также данных белорусских, польских и украинских исследователей проанализирована степень влияния аграрной реформы Жигимонта II Августа на процессы развития сельского хозяйства в частных владениях.

This article is dedicated to the condition of cattle-breeding in the noble's estates of Belarus in the second half of XVI – the first half of the XVII centuries. It shows the degree of influence of agrarian reforms of Zhygimont II August on the processes of development of agriculture of private estates. The investigation was made on the basis of archive documents and the works of Belarusian, Ukrainian and Polish researchers.

Другая палова XVI – пачатак XVII ст. былі часам рэформ для сельскай гаспадаркі Беларусі. У асноўным рэформы датычыліся ўдасканалення сістэмы землеўпарадкавання маёнткаў, а таксама метадаў земляробства. Аднак нельга сказаць, што захады Вялікага князя і прадстаўнікоў шляхты абмяжоўваліся выключна гэтымі аспектамі сельскай гаспадаркі. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца дэталёвы разгляд такога аспекту дзейнасці шляхецкіх фальваркаў, як жывёлагадоўля. Неабходна вызначыць стан тагачаснай жывёлагадоўлі, прасачыць дынаміку яе развіцця, яе рэнтабельнасць, сувязі з унутраным і знешнім рынкам, а таксама як уплываў фактар правядзення аграрнай рэформы ў велікакняжацкіх уладаннях на стан жывёлагадоўлі ў маёнтках сярэдняй і дробнай шляхты.

Некаторыя аспекты азначанага пытання закраналіся ў працах такіх навукоўцаў, як У.І. Пічэта[1], П.А. Лойка[2], М.С. Грушэўскі[3], Ежы Тапольскі[4] і інш. Аднак большай часткай даследаванні датычыліся стану жывёлагадоўлі ў велікакняжацкіх маёнтках, у сялянскіх гаспадарках і да т. п. Сітуацыя ж, што назіралася ва ўладаннях прадстаўнікоў сярэдняй і дробнай шляхты, велічыня ўплыву, які аказала валочная памера на шляхецкія гаспадаркі, часта заставаліся па-за межамі ўвагі навукоўцаў.

Гэтая тэма з'яўляецца надзвычай актуальнай для сённяшняга часу, бо яе падрабязны разгляд дае магчымасць вызначыць структуру сярэднявечнай жывёлагадоўлі, яе эфектыўнасць, сувязь з рынкам, а таксама шляхі, якімі землеўладальнікі імкнуліся павысіць эфектыўнасць сваёй гаспадаркі. Фактычна разгляд стану тагачаснай жывёлагадоўлі дазваляе больш выразна прасачыць эвалюцыю эканамічных адносін на Беларусі ад больш ранніх часоў да нашых дзён.

Са старажытных часоў жывёлагадоўля адыгрывала значную ролю ў гаспадарцы беларускіх зямель. Для прыватнаўласніцкага маёнтка яна азначала не толькі наяўнасць мяса, малака, скуры і поўсці. Акрамя гэтага, жывёлагадоўля з'яўлялася адной з асноўных крыніц атрымання прыбыткаў маёнтка, яе высокі ўзровень развіцця азначаў вялікую колькасць угнаенняў, што, у сваю чаргу, давала высокую ўраджайнасць збожжавых і іншых культур. Пры дапамозе коней і валоў селянін апрацоўваў уласны і панскі надзел. Так што гарманічнае развіццё маёнтка забяспечвала не толькі земляробства, але і добрае развіццё жывёлагадоўлі.

Не дзіўна, што ў большасці інвентароў, як, напрыклад, у інвентары маёнтка Вязавец Слонімскага павета за 1583 г.[5], апрача пераліку сялян, колькасці сыноў і колькасці займаемых валок, асобная ўвага ўдзяляецца колькасці коней і валоў. У в. Юрэўскае маёнтка Вязавец на 19 сялянскіх сем'яў налічвалася 13 коней і 31 вол, на 9 сем'яў в. Нюхі – 9 коней і 13 валоў, на 24 сям'і в. Чырычы – 22 кані і 27 валоў і ў чацвёртай вёсцы, назва якой адсутнічае, на 16 сялянскіх сем'яў налічвалася 9 коней і 22 валы.

Відавочна, што кожная сялянская гаспадарка мела адну ці дзве цяглавыя жывёлы. Коней было менш. Гэта было звязана з тым, што ў азначаны перыяд конніца яшчэ не страціла свайго дамінуючага значэння ў вайсковай справе. Вайсковая

дактрына дзяржавы вымагала вялікай колькасці коней. Яшчэ ў 1528 г., паводле Ухвалы на вялікім сойме Віленскім, было ўстаноўлена, што «ижъ хто-колвек маеть людеи своих в имениях своихъ, тотъ повиненъ с кожъдыхъ всми служобъ людеи ставити пахолка на добром кони во зброи»[6]. Таму коні карысталіся павышаным попытам на рынку і адпаведна кошт на іх быў досыць высокі. Згодна з арт. 1 раздз. 13 Статута Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) жарабец каштаваў 8 коп грошай, кабыла – 4 капы грошай, а кошт на хатніх працоўных коней вызначаўся ў 2 капы грошай[7]. Пры гэтым сустракаліся выпадкі, калі ў маёнтках цалкам адсутнічалі коні і валы. Гэта магло здарыцца па шэрагу прычын: падзеж жывёлы, рабаванне з боку войска і інш. У якасці прыкладу можна прыгадаць інвентар маёнтка Цялесніцы Берасцейскага ваяводства, складзены пры продажы яго Паўлам Каханоўскім Лаўрыну Войне за тры тысячы коп літоўскіх грошай: «Обора. Хлевовъ з хворосту плетеныхъ большыхъ два, а меншыхъ 3. Коні стадные: свирепъ большыхъ три, а жеребцовъ два. Быдла рогатого большого 20, а телятъ з року 10, быковъ 4»[8]. Далей ідзе падрабязны пералік авечак, коз, свіней, гусей і качак. Відавочна, што фальварак спецыялізаваўся на жывёлагадоўлі, аднак колькасць коней выразна дысаніруе з колькасцю астатняй жывёлы. Гэта можна патлумачыць тым фактам, што маёнткі, арыентаваныя на земляробства, мелі значна большую патрэбу ў конях, чым маёнткі, дзейнасць якіх была накіравана на жывёлагадоўлю.

Варта заўважыць, што арыентацыя маёнтка на жывёлагадоўлю зусім не азначала поўную адмову ад земляробства. Яно існавала ў падобных фальварках, але аб'ём ворыва дворнага быў невялікі, дастатковы толькі для задавальнення ўласных патрэб землеўладальніка. Велічыню асартыменту прадукцыі двара, арыентаванага на жывёлагадоўлю, можна назіраць на прыкладзе маёнтка Ласосін Слонімскага павета[9]. Рэестр быў створаны ў 1617 г. пры перадачы гэтага маёнтка Іванам Хадаровічам Яну Садомскаму. Дадзеныя ў дакуменце змешчаны крыху хаатычна, таму яны падаюцца ў зменenай паслядоўнасці. Маёнтак Ласосін налічваў жывёлы: дойных кароў – 32, цялят – 32, ялавіц – 11, быкоў-трохгодак – 10, быкоў-двухгодак – 8, валоў – 1, у арэндзе ў сялян знаходзілася: валоў – 10, коз – 13, казлоў – 6, свіней – 11, гусей – 72, індыкоў – 11, курэй – 95, каплуноў – 11. Варта адзначыць, што падобны асартымент хатняй жывёлы назіраецца таксама ў інвентарах маёнткаў Цяпіна[10], Магільна[11], Князінін[12] і Гатава[13]. Усё гэта сведчыць пра тое, што незалежна ад рэгіёну існавалі агульныя рысы ў развіцці жывёлагадоўлі. Асартымент прадукцыі жывёлагадоўлі ў шляхецкіх гаспадарках розных частак беларускіх земляў фактычна аднолькавы. Таму ў адрозненне ад земляробства, дзе мы можам вызначыць пэўныя рэгіянальныя асаблівасці, пры разглядзе жывёлагадоўлі ў шляхецкіх фальварках на Беларусі ёсць падставы аналізаваць іх агульным масівам.

Як бачым, дзейнасць маёнтка Ласосін была накіравана збольшага на развіццё жывёлагадоўлі. Менавіта гэтаму кірунку развіцця сельскай гаспадаркі надавалася прыярытэтнае значэнне. Рэестр маёнтка не змяшчае дадзеных пра «пашню дворную», яе памер. Скупа пададзены звесткі пра колькасць збожжа і гародніны, ды і сама колькасць не вельмі вялікая. Затое хатняй жывёлы, як бачна, разводзіцца шмат і звесткі пра яе пададзены з вялікай дакладнасцю і падрабязнасцю. Пры гэтым варта зазначыць, што маёнтак Ласосін знаходзіўся ў найбольш спрыяльным рэгіёне для развіцця фальваркавай гаспадаркі, заснаванай на экспарце збожжа ў Еўропу (Панямонне).

Не заўжды інвентарныя вопісы маёнткаў дакладна сведчаць нам пра наяўнасць хатняй жывёлы ў гаспадарцы. У некаторых выпадках пра гэта можна даведацца па ўскосных дадзеных. У якасці прыкладу можна прывесці апісанне маёнтка Бучы, створанае паводле інвентару ад 7 студзеня 1643 г.[14] Маёнтак быў арыентаваны на земляробства і таму інвентарны вопіс дае нам звышпадрабязную інфармацыю адносна пабудоў у фальварку і колькасці намалочанага збожжа. Аднак у тэксце інвентару сустракаюцца згадкі пра «стайню, саломай крытую, вароты да якой дранкай пакрытыя. Абору, у якой шэсць загарадак драўляных зроблена». Зыходзячы з гэтых ускосных дадзеных, ёсць падставы меркаваць, што наяўнасць дзвюх стайняў сведчыць нам пра тое, што ў маёнтку была пэўная колькасць коней, а наяўнасць аборы з шасцю драўлянымі загародкамі даказвае, што маёнтак меў як мінімум 6 кароў. Таксама падобную заканамернасць можна назіраць і на прыкладах інвентароў маёнткаў Прэшчыца Гарадзенскага павета[15], Лунінец Малы[16], Беркіняны[17], Рагозін[18] і інш. Усе гэтыя інвентарныя вопісы былі створаны пры продажы ці перадачы маёнткаў. Звычайна землеўладальнікі ў падобных выпадках былі схільныя да звышпадрабязнага апісання маёмасці, каб мець магчымасць за кошт гэтага крыху завысіць кошт маёнтка. У той жа час колькасць ворыўнай зямлі і засеянага жыта разглядаецца звышпадрабязна. Той факт, што ў азначаных інвентарах узгадваюцца аборы, хлявы і стайні, але не ўзгадваецца колькасць статку дворнага, сведчыць нам пра тое, што гэта былі маёнткі, не арыентаваныя на земляробства, з дворнай жывёлагадоўляй у зачаткавым стане.

Нельга не ўзгадаць той факт, што землеўладальнік быў зацікаўлены не толькі ў развіцці дворнай жывёлагадоўлі, але і сялянскай. У якасці прыкладу можна ўзгадаць рэестр валочнай памеры грунтоў маёнтка Шчучын за 1594 г.[19] Ва ўсіх вёсках і фальварках, якія адносіліся да азначана-

га маёнтка, асобным артыкулам ідзе: сенажаці дворныя і сенажаці сялянскія, выганы дворныя і выганы сялянскія. Пры правядзенні валочнай памеры землеўладальнікі асобна вызначалі колькасць зямлі, неабходную для жыццядзейнасці гаспадаркі селяніна. Гэты факт сведчыць нам пра тое, што тагачасная шляхта цудоўна асэнсоўвала, што моцная сялянская гаспадарка азначала моцную гаспадарку землеўладальніка, і рабіла захады да паляпшэння ўмоў гаспадарання для селяніна.

Маёнткі, арыентаваныя на вырошчванне і продаж жывёлы, былі больш характэрны для тых тэрыторый Беларусі, дзе ўмовы мясцовасці рабілі нерэнтабельным шырокае развіццё земляробства. У асноўным гэта была Палеская зямля. Пра тое, што жывёлагадоўля была асабліва развітая ў гэтых мясцінах, сведчыць захаванне менавіта ў маёнтках на поўдні Беларусі і на поўначы Украіны старой павіннасці пад назвай «валоўшчына» ці «павалоўшчына». Яе сутнасць заключалася ў тым, што з кожнай галавы буйной рагатай жывёлы збіраўся грашовы падатак. Валоўшчына як асобны падатак сустракаецца толькі на гэтых землях, што сведчыць пра прыярытэт жывёлагадоўлі на азначаных тэрыторыях. Гэта звязана з вялікай зацікаўленасцю земляў Кароны Польскай у экспарце жывёлы, у прыватнасці валоў з паўднёвых земляў ВКЛ. Так, М. Грушэўскі, спасылаючыся на польскага даследчыка М. Стаўскага, прыводзіць наступныя дадзеныя па правозу жывёлы праз Кракаўскую мытную камору. У 1510 г. было правезена 4424 валы, іншай худобы – 1909, скур – 31 781. У 1533 г.: валоў – 30 118, коней – 630, скур валовых – 66 707[20]. Відавочны вялізны рост экспарту прадуктаў жывёлагадоўлі за 20 гадоў. Гэтыя факты сведчаць пра тое, што на тэрыторыі ВКЛ жывёлагадоўля дынамічна развівалася ў азначаны перыяд часу.

Жыгімонт II Аўгуст у сваёй Уставе на валокі стварае асобную катэгорыю сялян, якія мусілі глядзець за жывёлай у маёнтку. Пра гэта сведчыць арт. 21 Уставы: «Пры кождом фолварку нашом хочем мети дворнички, то есть рыкуньи порадные, котрым на рок за працу их з нашых пенезей по две копе грошеи маеть быти давано от ураду а тры бочки жыта з гумна нашого а четвертая с третего снопа врадничого на выхованье, для чого пры кождом фолварку нашом мають ховати прынамней до двадцати коров; а естли бы так много не было, ино з гуменных пенезей купити, колько можеть который двор выховати, и то перед ревизором оказати, и маеть врад в дойзренью и доброй опатрности быдло дворное мети»[21].

Варта адзначыць, што ў дарэформенны перыяд жывёлагадоўля ў шляхецкіх гаспадарчых маёнтках развівалася недастаткова. Арыентацыя гаспадарчых двароў на самадастатковасць не давала магчымасцей для ўдасканальвання жывёлагадоўлі, да павелічэння статка дворнага. У.І. Пічэта прыгадвае факт, што ў інвентарным вопісе маёнтка Варнены, які меў дастатковую колькасць апрацоўваемай зямлі, прыгадваецца толькі тры клячы рабочыя[22].

Велікакняжацкі маёнтак мусіў мець не менш за дваццаць галоў буйнога рагатага быдла, а для дагляду за ім стваралася катэгорыя сялян – «рыкуньи». Прадстаўнікі шляхты імкнуліся не адстаць ад Вялікага князя і таму вельмі часта жывёлагадоўля ў іх маёнтках знаходзілася ў значна лепшым становішчы. Гэта адбывалася па той прычыне, што звычайна ў тых маёнтках, якія арыентаваліся на жывёлагадоўлю, у дадзеную галіну сельскай гаспадаркі ўкладваліся вялізныя інвестыцыі, накіраваныя на паляпшэнне пароды жывёлы. Канешне, большай часткай гэта характэрна для маёнткаў, што належалі прадстаўнікам буйной шляхты. У якасці прыкладу можна прывесці інвентар маёнтка Смаргонь за 17 кастрычніка 1601 г., які належаў берасцейскаму ваяводу Хрыстафору Зяновічу. У пераліку жывёлы гэтага маёнтка асобным пунктам стаіць пародзістая жывёла. Так, напрыклад: «Голландский скот: коров голландских дойных 15. Бурый голландский бык. Телят годовалых: бычков 3, а телок 5. Итальянские овцы: овец старых итальянских 18, скопцов старых 3, а баранов 2, овец нынешнего года 6, а баранов 5. Волы голландские: волов голландских больших 4, волов из Глубокого 6, яловка купленная 1. Голландские свиньи: свиней старых 4 и молодых 6, хряк – один старый и один молодой. Голландские овцы: овец старых 3 и молодая 1, баранов старых 2 и скопцов 8»[23]. Як бачым, маёнтак Смаргонь быў таксама арыентаваны на развіццё жывёлагадоўлі. У асноўным жывёла закуплялася ў заходнееўрапейскіх краінах, у прыватнасці ў Галандыі і Італіі. Аднак была і іншая крыніца паступлення высокапароднай жывёлы на нашыя землі. Гэта былі ўкраінскія землі на поўдні ВКЛ. Калі буйное рагатае быдла, якое пастаўлялася з Галандыі, складала базу для развіцця малочнай жывёлагадоўлі, то шэрае сцяпное украінскае быдла разводзілася пераважна на мяса і выкарыстоўвалася ў якасці цяглавай сілы.

Факты, якія сведчаць нам пра тое, што беларускія землі не знаходзіліся збоку ад еўрапейскіх сельскагаспадарчых тэндэнцый, змешчаны ў інвентары маёнтка Тулава за 1640 г.[24] Так, сярод пераліку жывёл у аборы маёнтка сустракаюцца таксама індык, 2 індычкі і 9 індычанят (у тэксце маюць назву «куры калакуцкія»). Пры гэтым варта адзначыць той факт, што індыкі трапілі ў Еўропу толькі каля 1530 г. Вядома, што іх развядзеннем займаўся народ майя і толькі ў XVI ст. яны сталі вядомыя еўрапейцам. І той факт, што ўжо праз сто гадоў індыкі актыўна разводзіліся ў звычайным шляхецкім маёнтку, сведчыць пра шчыльныя эканамічныя кантакты беларускай шляхты з еўрапейскімі краінамі.

Такім чынам, можна адзначыць высокі ўзровень развіцця жывёлагадоўлі ў тагачасных шля-

хецкіх фальварках. Землеўладальнікі аператыўна адрэагавалі на новыя павевы ў эканамічным развіцці дзяржавы, выкліканыя валочнай памерай. Устава на валокі давала аптымальную на свой час арганізацыю гаспадаркі. Структура як земляробства, так і жывёлагадоўлі была ўпарадкаваная ў адпаведнасці з Уставай. Гэта давала магчымасці павысіць прыбытковасць фальваркаў, што, у сваю чаргу, дазваляла землеўласніку мець вольны грашовы рэсурс і свабодна аперыраваць ім. Да таго ж на той час жывёлагадоўля стала надзвычай прыбытковай галіной сельскай гаспадаркі. Землі Кароны Польскай былі зацікаўлены ў экспарце валоў з земляў ВКЛ. Адпаведна на валоў і іншую сельскагаспадарчую прадукцыю павышаліся кошты. Дзякуючы гэтаму, землеўладальнік мог інвесціраваць грошы ў паляпшэнне сваёй гаспадаркі. У выніку паляпшаліся пароды жывёл шляхам завозу прадстаўнікоў найлепшых еўрапейскіх парод. Таксама варта адзначыць, што фактычна на тэрыторыі ВКЛ адбываецца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі па рэгіёнах. Так, калі для фальваркаў, якія знаходзіліся ў Панямонні ды Пабужжы, больш характэрна земляробства, то для маёнткаў Палесся і ў пэўнай ступені Усходняй Беларусі – жывёлагадоўля. Аднак структура жывёлагадоўлі ў розных рэгіёнах Беларусі заставалася фактычна нязменнай. Асартымент жывёлагадоўчай прадукцыі, якую выраблялі шляхецкія фальваркі, быў адзіны для розных частак ВКЛ.

[1] Гл.: П и ч е т а  В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. М., 1958; Ё н  ж а. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. М., 1961.

[2] Гл.: Л о й к а  П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст. Мн., 1991.

[3] Гл.: Г р у ш е в с ь к и й  М. Історія Украіни – Руси. Київ, 1995. Т. 6.

[4] Гл.: T o p o l s k i  J. Przelom gospodarczy w Polsce XVI wieku i jego nastempstwa. Poznan, 2000; Ё н  ж а. Narodziny kapitalizmu w Europie XIV–XVII wieku. Poznan, 2003.

[5] Гл.: НГАБ. Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 7. Л. 95–108.

[6] Ухвала на вялікім сойме Віленскім 1528 года // Перапіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года / Пад рэд. Г.Я. Галенчанкі. Мн., 2003. С. 49.

[7] Гл.: Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года / Пад рэд. І.П. Шамякіна. Мн., 1989.

[8] АВАК. Т. 14. Спр. 13. С. 185–190.

[9] Гл.: ЦДА Літвы. Ф. 1292. Воп. 1. Спр. 190.

[10] Гл.: АВАК. Т. 14. Спр. 47. С. 411–415.

[11] Там жа. Спр. 51. С. 435–444.

[12] Гл.: ЦДА Літвы. Ф. 1280. Воп. 1. Спр. 18.

[13] Гл.: АВАК. Т. 14. Спр. 39. С. 355–364.

[14] Гл.: НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 778. Л. 51 адв.

[15] Гл.: Там жа. Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 56.

[16] Гл.: ЦДА Літвы. Ф. 1282. Воп. 1. Спр. 9991.

[17] Там жа. Ф. 1281. Воп. 1. Спр. 249.

[18] Там жа. Ф. 1282. Воп. 1. Спр. 3221.

[19] Там жа. Ф. 598. Воп. 1. Спр. 174.

[20] Гл.: Г р у ш е в с ь к и й  М. Історія Украіни – Руси. Київ, 1995. Т. 6. С. 196.

[21] Устава на валокі гаспадара караля яго міласьці ўва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім / Пад рэд. В.Ф. Голубева // Спадчына. 1993. № 4. С. 70.

[22] Гл.: П и ч е т а  В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. М., 1956. С. 148.

[23] Гл.: Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв. Владение Сморгонь / Под ред. П.Г. Козловского. Мн., 1977. С. 19–20.

[24] Гл.: ЦДА Літвы. Ф. 1177. Воп. 1. Спр. 6616.

Паступіў у рэдакцыю 25.09.08.

***Леанід Юр'евіч Казакоў*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу А.Г. Каханоўскі.